# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ПРАЦА Ў МУЗЕІ НАВУКІ І АСВЕТЫ ПОЛАЧЧЫНЫ

У 2004 г., да 60-годдзя вызвалення Беларусі і Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, была выпушчана кніга “Салдаты Перамогі Полацкага універсітэта”, у якой сабраны матэрыялы аб выкладчыках і супрацоўніках універсітэта – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта кніга аб выдатных людзях, чыёй працай, талентам ствараўся і развіваўся універсітэт.




**3. Вокладка кнігі “Салдаты Перамогі Полацкага універсітэта”**

У прысвячэнні да кнігі рэктар Полацкага дзяржаўнага універсітэта Дзмітрый Мікалаевіч Лазоўскі напісаў:

“Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто ў цяжкіх баях здабыў **Перамогу** ў Вялікай Айчыннай вайне. **Перамогу** над фашызмам, **Перамогу** над болем і крывёю, **Перамогу** над нястачай і разрухай, **Перамогу** ў імя мірнага існавання нашай Радзімы.

У розныя гады, на розных пасадах у нашай навучальнай установе працавалі і працуюць тыя, хто зведаў жах вайны.

Гэта кніга – наша даніна ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія былі побач з намі. Гэта кніга – імкненне выказаць нашу вялікую пашану і вялікую ўдзячнасць усім ім. Гэта кніга – наша памяць, наш гонар”.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**4. Ветэраны НПІ на святкаванні 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Плошча Будаўнікоў г. Наваполацка.**
**1 ліпеня 1974 г.**
*Фотаздымак Уладзіміра Ліпко.*
*Стаяць злева направа:*

1. **Яфімаў Мікалай Нікандравіч,** вучэбны майстар кафедры тэхнічных дысцыплін;
2. **Лугавы Барыс Георгіевіч,** намеснік дэкана вячэрняга факультэта;
3. **Арцюшэнка Ўладзімір Іванавіч,** загадчык кафедры начартальнай геаметрыі, чарчэння і графікі;
4. **Андрыянаў Пётр Сідаравіч,** прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай працы;
5. **Лугоўскі Сяргей Іванавіч,** прафесар, загадчык кафедры санітарнай тэхнікі і аховы працы;
6. **Яліссенка Іван Сяргеевіч,** загадчык лабараторыі кафедры тэхнічных дысцыплін;
7. **Разгонаў Сямён Рыгоравіч,** дацэнт кафедры тэхналогіі металаў і тэхналогіі машынабудавання.

*Фотаздымак з фондаў МНАП*

Удзельнік вайны, камісар эскадрыллі Аляксандр Арцём'евіч Чунароў прачытаў лекцыю па гісторыі КПСС у дзень адкрыцця вышэйшай навучальнай установы ў Наваполацку.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**5 – 6. Аляксандр Арцём'евіч Чунароў.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*

Свой след у гісторыі нашай ВНУ аставілі Мікалай Мікалаевіч і Ніна Мікалаеўна Літвінавы, якія працавалі з 1971 года.

Былы камандзір танка М. М. Літвінаў стаў кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам. У верасні 1971 года яго запрасілі на пасаду загадчыка кафедрай вышэйшай матэматыкі нашага філіяла, а потым ён быў дэканам механіка-тэхналагічнага факультета, дэканам вячэрняга факультэта…

Н. М. Літвінава з 1942 па 1945 год была ў працоўнай няволі ў Аўстрыі. Пасля вайны, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, абараніла кандыдацкую дысертацыю. Працяглы час была загадчыцай кафедры навуковага камунізма і марксісцка-ленінскай філасофіі ў ВНУ Наваполацка.



**7 – 8. Літвінавы**
**Мікалай Мікалаевіч і Ніна Мікалаеўна**

Вышэйшай салдацкай узнагародай – ордэнам Славы быў узнагароджаны ў гады Вялікай вайны Уладзімір Арцем'евіч Лёзін; кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, член Саюза журналістаў СССР у нашым інстытуце ён быў не толькі выкладчыкам, але неаднаразова абіраўся

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

сакратаром партыйнай арганізацыі.



**9. Уладзімір Арцем'евіч Лёзін.**
*Фотаздымак з фондаў МНАП*

Палкоўнік у адстаўцы Пётр Сідаравіч Андрыянаў, баявы афіцэр, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі "За адвагу" і "За баявыя заслугі" на пасадзе прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай працы зрабіў шмат у справу развіцця матэрыяльнай базы НПІ.



**10 – 11. Пётр Сідаравіч Андрыянаў.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*

Выдатнымі навукоўцамі і людзьмі з вялікай літары былі першыя прафесары Наваполацкага політэхнічнага інстытута С.І. Луговскі, А.М. Левін, А.І. Сямёнаў.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**12 – 13. Сяргей Іванавіч Луговскі.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*



**14 – 15. Аляксандр Маісеевіч Левін.**



**16 – 17. Аляксандр Іванавіч Сямёнаў.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*

Важкі ўклад у развіццё ўніверсітэта і асабліва геадэзічнага факультэта ўнёс дацэнт С.М. Чуракоў. Дагэтуль квітнее сад ва ўніверсітэцкім двары, пасаджаны І.С. Елісеенка. Выдатнымі педагогамі праявілі сябе К.І.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Анджыеўскі, М.А. Іскрыцкі, Я.С. Кулікоў, У.І. Арцюшэнка, С.Р. Разгонаў, Я.М. Крылоў, арганізатарамі навучальнага працэсу і адміністрацыйнай дзейнасці – Б.Г. Лугавы, А.А. Травін, Ю.Е. Шлопак, Л.М. Шмандурова, Н.А. Анкянец, А.Н. Афанасьеў.



**18. Іван Сяргеевіч Елісеенка.**
*Фотаздымак з фондаў МНАП*



**19 – 20. Разгонаў Сямён Рыгоравіч**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*



**21 – 22. Барыс Георгіевіч Лугавы.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*



PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**23 – 24. Аляксей Аляксеевіч Травін.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*



**25 – 26. Афанасьеў Аляксей Нікіфаравіч.**
*Фотаздымкі з фондаў МНАП*



**27. Ветэраны НПІ на базе адпачынку.**
**Воз. Чорнае, Полацкі раён.**
**9 мая 1990 г.**

Праз год, да 60-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Айчыннай вайне, выйшаў зборнік “Вялікая Айчынная вайна ў нашым лёсе” (складальнік – загадчыца Музея навукі і асветы Полаччыны Грудніцкая Тамара Аляксандраўна). У яго першай частцы “Салдаты Перамогі Полацкага універсітэта”, апублікаваны дадатковы матэрыял аб выкладчыках і супрацоўніках ПДУ, прымаўшых удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Другая частка зборніка “Апаленая памяць” заснавана на біяграфічных ўспамінах тых, чыё дзяцінства прыпала на ваеннае ліхалецце. Трэцці раздел “Вайна ў лёсе маёй сям’і” змясціў аповяд супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў аб сваіх родных, іх удзеле ў Вялікай Айчыннай, перажытых выпрабаваннях. У якасці ілюстрацый выкарыстаны малюнкі ветэрана вайны Я. Ф. Ігнаценкі, зробленыя ім у пасляваенныя гады.




**28. Вокладка зборніка “Вялікая Айчынная вайна ў нашым лёсе”**

Рэктар Полацкага дзяржаўнага універсітэта Дзмітрый Мікалаевіч Лазоўскі ў прадмове “**Вайна ў нашай памяці”** адзначыў:

“1418 дзён Вялікай Айчыннай вайны перажылі людзі вялікай краіны – Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. На адной шостай частцы зямнога шару пражывала на той час каля 200 мільёнаў чалавек. Яны былі розныя, гэтыя людзі: дзеці, маладыя, старыя; дзяўчаты і жанчыны, юнакі і мужчыны; рабочыя і сяляне, урачы і настаўнікі, паэты і мастакі; рускія і ўзбекі, беларусы і армяне, украінцы і грузіны... Яны жылі на вялікіх прасторах савецкай Радзімы ад Брэста да Ўладзівастока.

Час наканаваў ім перажыць і перамагчы трагедыю вайны. У кожнага яна была асабістай. Тысячы людзей загінулі ў першы дзень – 22 чэрвеня 1941 года, а ўсяго гэта вайна абарвала 27 мільёнаў чалавечых лёсаў. Гінулі, здзяйсняючы подзвіг, гінулі бездапаможнымі ў печах крэматорыяў, гінулі адголаду і нястачы... Усё ўмясціла ў сябе вайна, але галоўнае ў ёй – узыходжанне да высотаў чалавечай існасці, да подзвігу...

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Наша вышэйшая навучальная ўстанова бярэ свой пачатак у вялікай, шматнацыянальнай краіне – СССР. З Уладзівастока і Ташкента, Уфы і Цюмені, Саратава і Валгаграда, Калінінграда і Ленінграда і іншых гарадоў прыязджалі працаваць у нашу вну. За плячыма многіх з іх былі ваенныя шляхі, ваенныя ліхалецці...

Для нас дарагое кожнае слова ветэрана, які ваяваў; кожнае слова сведкаў, перажыўшых ваенны жах. Нам важна таксама стаўленне сучаснай моладзі да той вайны, да подзвігаў іх дзядоў і прадзедаў.

Мы шчаслівыя тым, што наша родная Беларусь ужо 60 гадоў жыве пад мірным небам. Але чалавецтва і на сёння не пазбаўлена ад войнаў, а кожная вайна – гэта серыя катастроф. Аб невялікай колькасці з іх расказвае гэты зборнік.

Гэта кніга – для вас, маладыя!"

Зборнік "Вялікая Айчынная вайна ў нашым лёсе" – гэта плён сумеснай працы выкладчыкаў, студэнтаў, супрацоўнікаў універсітэта. У якасці ілюстрацый да зборніка выкарастаны малюнкі ветэрана вайны Яўгена Фёдаравіча Ігнаценкі, зробленыя ім у першыя пасляваенныя гады, бо малюнкі, зробленыя ў час вайны, разабралі героі, адлюстраваныя на іх.



**29. Яўген Фёдаравіч Ігнаценка.**
**Аўтапартрэт.**
**7 мая 1945 г.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**30. Яўген Фёдаравіч Ігнаценка.**
**1940-я гг.**

У яго першай частцы *"Салдаты Перамогі Полацкага універсітэта"* апублікаваны дадатковы матэрыял да аднайменнага зборніка (2004) аб выкладчыках і супрацоўніках ПДУ, прымаўшых удзел у Вялікай Айчыннай вайне.

Сведкай і ўдзельнікам складанай гісторыі 20 стагоддзя паўстае постаць Канстанціна Іванавіча Анджыеўскага (1906 – 1995), былога выкладчыка кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі. Яго дзяцінства і юнацтва прышліся на бурныя рэвалюцыйныя гады пачатку XX стагоддзя, аднойчы і назаўжды прыняўшы Кастрычнік 17-го года, заставаўся верным яго ідэям і ідэалам да канца. Скончыўшы Камуністычны ўніверсітэт нацыянальных меншасцяў Захаду і выконваючы заданні партыі, быў і падпольшчыкам, і старшынёй Рэспубліканскага камітэта працаўнікоў асветы і мастацтваў Літоўскай ССР, і старшынёй калгасу, і выкладчыкам вну…



**31. Канстанцін Іванавіч Анджыеўскі**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**32. Наталля Афанасьеўна Анкянец (Каваленка)**
**у першыя пасляваенныя годы**



**33. На свяце Дня Перамогі.**
*Злева направа:*
**Пётр Іванавіч Швед, рэктар НПІ; Наталля Афанасьеўна Анкянец;**
**Віктар Аляксандравіч Іваноў, загадчык кафедры гісторыі КПСС і палітэканоміі.**
**Май 1983 г.**

У 16 гадоў Наталля Анкянец (Каваленка Наталля Афанасьеўна) атрымала сваю першую баявую ўзнагароду, медаль “За адвагу” (студзень 1943 г.), выявіў сябе як бясстрашны баец, падняўшы салдат у атаку… Як санінструктар, Наталля Анкянец спасла жыцці немалай колькасці салдат, выносячы іх з поля бая. У снежні 1943 года яна атрымала другую ўзнагароду – ордэн Славы III ступені, а ў жніўні 1944 г. – ордэн Чырвонай Зоркі. У канцы 1944 года – цяжкае раненне атрымала сама Наталля. Поўгода нерухомасці ў ваенным шпіталі. Вяртанне да мірнага жыцця…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**34. Іван Якаўлевіч Валуеў.**
**Красавік 1945 г.**



**35. Іван Якаўлевіч Валуеў**

15-гадовым падлеткам у вёсцы на Смаленшчыне ўпершыню сустрэў Іван Якаўлевіч Валуеў фашыстаў. Пасля весткі аб гібелі роднага брата ў няпоўных 18 год ён ідзе добраахвотна на фронт…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**36. Мікалай Аляксандравіч Іскрыцкі.**
**г. Асад. Венгрыя.**
**Восень 1945 г.**



**37. Мікалай Аляксандравіч Іскрыцкі**

Мікалай Аляксандравіч Іскрыцкі вясной 1942 года 17-гадовым дабравольцам пачаў службу на Паўночным флоце. Баявое хрышчэнне атрымаў у баях з горнымі стралкамі на подступах да Мурманска, а вайну заканчваў у Аўстрыі, пад Венай. Мікалай Аляксандравіч ва успамінах салдата апавядае аб апошніх стрэлах вайны і аб кошце ваеннай узнагароды…

Апошнія гады працоўнай дзейнасці Яўгена Міхайлавіча Крылова, заслужанага настаўніка БССР былі звязаны з нашай навучальнай установай. Аб ваенных гадах яго біяграфіі распавяла Валянціна Сяргееўна Крылова.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**38. Яўген Крылоў –**
**матрос Чырвоназнамённага Амурскага флота.**
**1945 г.**



**39. Яўген Міхайлавіч Крылоў з вучнямі у абсерваторыі**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**40. Леанід Іванавіч Усціненка**
**ў гады Вялікай Айчыннай вайны**



**41. Леанід Іванавіч Усціненка.**
**Вяртанне да мірнага жыцця.**
**1948 г.**

Леанід Іванавіч Усціненка прайшоў праз дзве вайны – Фінскую і Вялікую Айчынную. Яшчэ ў 1939 годзе, калі ён быў курсантам Ленінградскага ваеннага вучылішча па падрыхтоўцы малодшых камандзіраў, упершыню пабачыў Петрадварэц, ад якога быў у захапленні. А ў 1944 годзе Леанід Іванавіч асабіста размініраваў 670 мін, пакінутых фашыстамі, зрабіўшы своё ўкладанне ў вяртанне прыгажосці.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**42. Сяргей Міхайлавіч Чуракоў** (крайні злева)
**з аднапалчанамі на месцах былых баёў.**
**г. Чарняхоўск, Калінінградская вобласць.**
**1985 г.**

Сяргею Міхайлавічу Чуракову, ленінградцу па нараджэнню і па выхаванню, выпала ваяваць… Добра валодаючы словам, ён рабіць натуральныя замалёўкі перажытага ў гады вайны. У яго ўспамінах прысутнічае горкі роздум (“Жаркае лета 1942 года”, “Зіма 1943 года, альбо Кошт жыцця”), храналагічна-дакументальны аповяд (“Усходняя Прусія” (1944 – 1945 гг.), якія набліжаюць праўдзівае ўяўленне аб вайне.



**43. Франц Казіміравіч Шарай**

Франц Казіміравіч Шарай у 18 год быў прызваны на вайну пасля вызвалення роднай вёскі на Аршаншчыне ад фашысцкіх захопнікаў у чэрвені

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

1944 года. Пасля праходжання воінскай вучобы – удзел ва Усходне-Прускай аперацыі, цяжкае раненне. Вяртанне да мірнага годнага жыцця…



**44. Яўген Фёдаравіч Ігнаценка.**
**Лямпа.**
**2 лістапада 1945 г.**

Другая частка зборніка *"Апаленая памяць"* заснавана на біяграфічных успамінах тых, чыё дзяцінства прыпала на ваеннае ліхалецце.



**45. Уладзімір Алексеенка**
**ў Ташкентскім сувораўскім вучылішчы.**
**1943 г.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**46. Уладзімір Аляксандравіч Алексеенка.**
**2005 г.**

Уладзімір Аляксандравіч Алексеенка у 1943 годзе у 10-гадовым узросце быў прыняты Ташкентскае сувораўскае вучылішча, куды прымалі толькі хлопчыкаў у якіх бацькі загінулі на фронце. Рэжым, парадак, дысцыпліна – усё было падпарадкавана таму, каб падрыхтаваць сапраўдных будычых афіцэраў. Было шэфства над цяжка раненымі, якія знаходзіліся ў ваенных шпіталях Ташкента. Была ваенная нястача, якую адчувалі сувораўцы. А яшчэ была сустрэча ў адным з паркаў з Ганнай Ахматавай… Закалка, атрыманая ў тыя гады, паўплывала на ўвесь далейшы лёс Уладзіміра Аляксандравіча, які выбраў "рыцарскі" від спорту – фехтаванне.

Іван Фядосавіч Буракоў ўсё жыццё памятае апошняю сустрэчу сына і бацькі. Памятае і бацькоўскую "слязу, буйную і чыстую, як кропля расы, якая пракацілася па яго шчацэ і звалілася мне на руку". Гэта адбывалася 25 чэрвеня 1941 года, калі 300 мужчын з вёскі Скепня Жлобінскага раёна на Гомельшчыне былі прызваны ў армію. Да дому вярнулася толькі 20…

У васьмігадовым узросце, зведаўшы канцлагер Саласпілс, Аліна Сяргееўна Строк стала пастушкай у жорсткіх і хцівых гаспадароў. Пазнала прыніжэнні, здзекі, голад і холад…

У Уладзіміра Гаўрылавіча Ткачова ў вайну загінулі чатыры браты. Сям'я ў восень 1943 года была вывезена на працу ў Германію. Вызвалілі англійскія войскі. Вялася вялікая прапаганда дзеля таго, каб засталіся на Захадзе. Але і бацькі і дзеці марылі аб вяртанні на Радзіму…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**47. Людміла Міхайлаўна Шмандурава**
**ў час прыняцця ваеннай прысягі ўнакам**

900 блакадных дзён пражыла ў Ленінградзе Людміла Міхайлаўна Шмандурова. З шасцігадовага ўзросту пазнала яна, што такое мужнасць і самаахвярнасць дзеля жыцця іншых. Запомнілась эвакуацыя праз Ладагу ў весну 1944 года. Фашысцкая авіяцыя бамбіла караблі на якіх спасаліся жанчыны і дзеці. Сотні загінуўшых плавалі па возеры. Такое не забываецца. Не забываецца і той маладзенькі матрос, які засланіў пры абстрэле ад куль маленькіх дзяцей…



**48. Яўген Фёдаравіч Ігнаценка.**
**Малы.**
**1940-я гг.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Трэці раздел *"Вайна ў лёсе маёй сям'і"* змясціў аповяд супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў аб сваіх родных, іх удзеле ў Вялікай Айчыннай, перажытых выпрабаваннях.



**49. Уладзімір Васільевіч Рыжкін**

Аб Уладзіміру Васільевічу Рыжкіну, бацьку-памежніку, які стаяў ля вытокаў станаўлення Дзяржаўнай граніцы СССР, распавядае Нонна Уладзіміраўна Ашчэпкава, дацэнт кафедры фізікі ПДУ. Служба ў Сярэдняй Азіі, на Каўказе і на захадзе Украіны, на граніцах з Манголіяй, Кітаем і Японіяй. 22 чэрвеня 1941 года сем'я Рыжкіных на Далёкім Усходзе. Нядзельны гарачы летні дзень. Усе ў садзе. Кожны заняты сваёй справай. Цішыня і пакой. Раптоўнае: "Вайна!"… Ахоўваць далёкаўсходняю мяжу ў гады Вялікай Айчыннай вайны было небяспечна і адказна. Тут здзяйсняліся подзвігі, гінулі людзі, праводзіліся баявые і выведвальныя аперацыі.



**50. Уладзімір Фёдаравіч Балгарэнка**

Любоў Уладзіміраўна Дмітрачэнка, бібліёграф 1-й катэгорыі Навуковай бібліятэкі ПДУ, звярнулася з удзячнай памяццю аб бацьку Балгарэнка Уладзіміру Фёдаравічу, які адваяваў на франтах Айчыннай вайны з яе першых дзён. Да канца свайго жыцця насіў Уладзімір Фёдаравіч у сабе

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

памятку вайны – фашысцкую кулю і асколак снарада. Аб яго мужнасці сведчаць узнагароды – 4 ордэна і 11 баявых і юбілейных медалёў.

Аб пражытым ліхалецці ў вёсцы Бабынічы, што на Полаччыне, распавяла выпускніца фінансава-эканімічнага факультэта Таццяна Дзембінская. Бабынічы не сталі выключэннем сярод беларускіх вёсак. Як і паўсюль на Беларусі, тут разгарнулася партызанская барацьба.

Ірына Дабіжа, студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта, распавяла аб сваім прадзеду Мікалаю Станіславічу Цішкевічу, які прымаў удзел у выратаванні дзяцей дзіцячага дома у Быкаўшчыне, што каля Ветрына і трагічным лёсе адной сям'і. Мікалай Станіславіч Цішкевіч і яго дачка Насця загінулі пад час Ушачскага прарыву; загінуў у Полацкай турме дзядулін брат; у зямлянцы спалены зажыва бацька бабулі Ірыны. "Гэта толькі маленькі фрагмент з гісторыі адной простай сям'і. А колькі такіх сем'яў пацярпела ад гэтай жорсткай вайны?!" – ускліцае ў канцы Ірына Дабіжа.



**51. Генадзій Пятровіч Грозберг** (стаіць трэці злева)
**на сустрэчы з партызанскімі сябрамі**

У 1975 годзе Генадзію Пятровічу Грозбергу, настаўніку сш № 4 г. Наваполацка было прысуджана званне "Заслужаны настаўнік Беларускай ССР". Аб партызанскім пачатку свайго бацькі распавёў загадчык кафедры "Канструіраванне і тэхналогія РЭС", дацэнт Юрый Генадзьевіч Грозберг.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**52. Мікалай Пятровіч Шамрыла**

Партызанам, настаўнікам, пісьменнікам быў Мікалай Пятровіч Шамрыла, бацька Людмілы Мікалаеўны Сурмач, бібліятэкара 1-й катэгорыі ПДУ. На суд чытачоў Людміла Мікалаеўна прадставіла ўспаміны аб той вайне, апавяданні бацькі, якія былі надрукаваны ў літаратурным альманаху пры Петрыкаўскай раённай газеце “За новыя рубяжы” – “Маці”, “Гузік з зорачкай”, “На Эльбе”.



**53. Юнга Вячаслаў Пятроў**
**1942 г.**

Дзяцінства бацькоў Ірыны Вячэслаўны Антохінай, урача медпункта ПДУ, прайшло ў страшэнных выпрабаваннях голадам у блакадным Ленінградзе. Паміраючага ў Ленінградскім педыятрычным інстытуце 12-

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

гадовага Вячаслава Пятрова, забраў яго бацька, мічман ваенна-марскога флота. Разам да канца вайны яны неслі службу на мінным тральшчыку ў Фінскім заліве, абараняючы падступы з боку Балтыйскага мора да легендарнага горада…



**54. Людміла Анрэеўна і Яўгеній Рыгоравіч Салаўёвы. Аўстрыя. 1945 г.**

Аб лёсе франтавікоў Салаўёвых – бацьку і двух сынах, успамінала Людміла Анрэеўна, бабуля студэнта гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандра Салаўёва. Сама Людміла Анрэеўна пачынала санітаркай у медсанбаце. “Напачатку было цяжка: кроў, стогны, раны… Плакала, охала… Сёстры абмацарацць: “Ідзі ў куток і пераплач”. Ніякіх гераічных учынкаў мы не здзяйснялі, а проста працавалі да знямогі – так было трэба” – успамінае Людміла Анрэеўна. Летам 1944года Л. А. Салаўёва была пераведзена ў штаб дывізіі, якая ваявала на Карэльскім і Фінскім франтах. Потым была Польшча. Канец вайны сустрэла ў Брэслау.

Людміла Анрэеўна Салаўёва распавяла аб свах аднакласніцах і суседках, адны з якіх былі накіраваны ў лазнева-праральны атрад, дзе пралі ўсё ўручную; іншыя – на хлебапекрню, дзе па 12 гадзін у змену выпекалі хлеб для салдат на фронце…

Пілюшына Ала, студэнтка групы 00-ФЯ, у нарысе “Ягады на крыві” распавяла аб адной з жудасных гісторый вайны. У 1943 годзе, калі вёска Ліпаўка на Верхнядзвіншчыне была спалена, застаўшыхся ў жывых яе жыхароў фашысты адправілі ў лагеры смерці. Валянціна Васільеўна Пілюшына (бабуля Алы Пілюшынай) пабывала ў чатырох з іх, у тым ліку ў Саласпілсе і Майданеку. Сотнямі тысяч памiралі ад непасільнай працы, гінулі ў камерах-душагубках, спальваліся ў крэматорыях. Самае жудаснае было ў тым, што попел, які заставаўся ад спаленых людзей, немцы выкарыстоўвалі ў якасці ўгнаення пад клубніцы. Потым жа гэты ягады пасылалі ў Германію – ягады, якія выраслі на людской крові…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**55. Каменькова Ганна Афанасьеўна**

Заканчваецца зборнік сімвалічным аповядам Каменьковай Ганны Афанасьеўны "Толькі б вайны не было…", запісанным Людмілай Касьянавай, студэнткай групы 02-АЯ. Ганна Афанасьеўна нарадзілася ў вёсцы Тросніца на Полыччыне. На яе долю выпалі цяжкія выпрабыванні. Як і ўсе застаўшыяся ў вёсцы, яна дапамагала партызанам, аказвала ім медыцынскую дапамогу, прала іхную бялізну, хавала ад фашыстаў… Калі Тросніцу вызвалілі ад фашыстаў, Ганну Афанасьеўну прызвалі ў армію, дзе яна павінна была мыць бялізну. Гэта была непасільная праца… Пазнаўшы ваенныя цяжкасці Каменькова Ганна Афанасьеўна сцвярджае: "Зараз жыць добра, крыўдзіцца няма чаго. Толькі б вайны не было…"



**56. Яўген Фёдаравіч Ігнаценка.**
**Успаміны салдата…**
**8 мая 1946 г.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У 2010 годзе да 65-годдзя Вялікай Перамогі ва ўніверсітэце падрыхтаваны новы зборнік “Вялікая Айчынная вайна ў нашых лёсах”. У адрозненне ад папярэдніх зборнікаў, прысвечаных тэме вайны, – “Солдаты Победы Полоцкого университета” і “Великая Отечественная в наших судьбах”, у якіх змешчаны ўспаміны непасрэдных удзельнікаў вайны, – новы зборнік складаюць аповяды нашых сучаснікаў аб лёсе блізкіх і родных, якім выпалі выпрабаванні 1941 – 1945 гг.




**57. Вокладка зборніка**
**“Вялікая Айчынная вайна ў нашых лёсах”**

Рэктар УА “ПДУ” Дзмітрый Мікалаевіч Лазоўскі ва ўступе сказаў:

“Вялікая Айчынная вайна… Памяць пра яе – ў велічных мемарыялах і сціплых помніках на зямлі Беларусі, у літаратурных вобразах і творах выяўленчага мастацтва, у музыцы і песнях.

Падзеі 1941 – 1945 гадоў ужо даўно сталі гісторыяй. Не было ў нашай краіне сям’і, якую б абмінуў злавесны цень тых страшных часоў. Сведкі гэтых трагічных падзей могуць многае паведаць нам пра выпрабаванні, якія выпалі на іх долю, пра цяжкасці і нягоды, што ім давялося вынесці. Вялікая Перамога аплачана мільёнамі жыццяў, слязамі родных і блізкіх.

Сёння свет належыць моладзі, якая не ведае, што такое ваеннае ліхалецце. Наступнае пакаленне будзе ведаць пра Вялікую Айчынную вайну толькі з нашых слоў. Галоўнае, каб гэты ланцужок не перарваўся…”

Асноўны матыў зборніка “Вялікая Айчынная вайна ў нашых лёсах” – пачуццё гонару за сваіх бацькоў, родных, блізкіх, якія і падчас страшных выпрабаванняў не страцілі чалавечай годнасці, мужнасці. Пранікнёныя словы

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

ўдзячнасці гучаць з вуснаў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.

Бацька Сцяпана Рыгоравіча Ехілеўскага, дэкана факультэта інфармацыйных тэхналогій прымаў удзел у вызваленні Полацка. Ён нарадзіўся ў Полацку, у даваенны час рос на вуліцы Бязбяжной, паспеў закончыць тут 7 класаў. Потым – эвакуацыя ў Сярэднюю Азію, дзе яго ў 17 год і два месяца прызвалі на вайну. Летам 1944 года ён не пазнаў свой родны Полацк… Да аповяду пра бацьку дадаецца рэдкі дакументальны матэрыял з кнігі С. Г. Камакіна “Вела вперёд нас к Родине любовь”, у якім раскрываецца баявы шлях 51 стралковай Віцебскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені дывізіі, якая вызваляла Полацак, у шэрагах якой у складзе 348 гвардзейскага палка быў і Рыгор Ехилевский.




**58. Знак удзельніка вызвалення Полацка**



**59. Рыгор Ехілеўскі.**
**15 мая 1944 г.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**60. Рыгор Львовіч Ехілеўскі**
**12 сакавіка 2007 г.**



**61. На данецкай зямлі ля бярозкі, прывезенай саджанцам з Полацка**
**Ехілеўскія Тамара Сцяпанаўна, Рыгор Львовіч**
**і малодшы сын Сцяпан Рыгоравіч.**
**2002 г.**
*Фотаздымак з газеты "Наш Дом +", 2003.10.10.*

Аб ваенным лётчыку, штурмане, палкоўніку авіяцыі Дзям'яне Кузьмічу

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Грыневе, распавядае яго сын Венядзікт Дзям'янавіч Грынёў, дацэнт кафедры будаўнічых матэрыялаў.



**62. Лётчыкі-аднапалчане.**
**1941 – 1942 гг.**
**Дзям'ян Кузьміч Грынеў** *(2-і рад, другі злева)*.

## ***Памяти Гринёва Демьяна Кузьмича – штурмана, полковника авиации, моего отца***

Мне помнится – был ли я там или не был –
То жаркое лето, июньское небо,
Где «юнкерсов» тени ползли по земле,
За ними огни в черно-дымчатой мгле.

Горят самолеты, горят Скоморохи ...
Шутили пилоты: «Не так дела плохи,
Вот три эскадрильи Гребышев бомбили,
Ребята там танков колонну спалили».

Бои и победы, бои – пораженья,
И гибель друзей – наши боль и сомненья.
Но верили свято: победа за нами,
Прогоним фашистов – обнимут нас мамы.
Идут «ИЛ-4» в сплетенных нарядах
Из частых разрывов зенитных снарядов.
С небес и земли все нас ловят в прицелы,
А мы еще живы, а мы еще целы.

Вот сбросили бомбы, затем отвернули,
Исчезла удача – попали под пули,
Дотянем до фронта, дотянем помалу,
И раненый штурман склонился к штурвалу.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Полеты, потери, бои без пощады …
И нас утешают награды, награды,
Ты – Сталинский сокол, ты – Сталинский сокол.
В гнездовье вернулся один лишь из сотни.

Им было под тридцать, и жить так хотелось,
Им было под тридцать, их песни не спелись ...

Мікалай Іванавіч Анціпін, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры фізвыхавання і спорта ПДУ, яго брат і дзве сястры, падзяліліся ўспамінамі і копіямі сямейных архіўных дакументаў аб удзеле бацькоў Кандрацьевай (Анціпінай) Вольгі Антонаўны і Анціпіна Івана Фёдаравіча ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.





Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
БССР
ПАСВЕДЧАННЕ № 230996
Анціпіна/Кандрацьева/
Вольга Антонаўна
сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 28 снежня 1942 г.
па 27 чэрвеня 1944 г. у якасці
партызанкі отрада імя Кутузава брыгады „За Савецкую Беларусь" Віцебскай вобласці
Намеснік старшыні выканкома
Гарадоцкага
раённага Савета
дэпутатаў працоўных

Удостоверение участника ... вручено
БССР
УДОСТОВЕРЕНИЕ № 230996
Антипина/Кондратьева/
Ольга Антоновна
действительно участвовал в партизанском движении в Белоруссии в период Великой Отечественной войны с 28 декабря 1942 г.
по 27 июня 1944 г. в качестве
партизанки отряда имени Кутузова, бригады „За Советскую Белоруссию" Витебской обл.
Зам. Председателя исполкома
Городокского
районного Совета
депутатов трудящихся
М.П. 3 декабря 1969 г.

**63 – 64. Пасведчанне партызана Беларусі**

Сібірак, удзельнік цяжкіх баёў за беларускі горад Гарадок Іван Анціпін і беларуская партызанка (стала ў 16-гадовым узросце) Вольга Кандрацьева, сустрэліся ў г. Савецку (былы Цільзіт). Яе, ужо інструктара Гарадокскага РК ЛКСМБ, накіравалі туды сакратаром гарадскога кіраўніцтва.

Шмат роздуму, нам сённяшнім, можа даць характарыстака,

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

выдадзенная ў 1946 годзе…


Характеристика
на инструктора Городокского РК ЛКСМБ
Кондратьеву Ольгу Антоновну.

Тов. Кондратьева О.А. рождения 1925 год, кандидат в члены ВКП(б) с августа 1945 года, белоруска, образование 7 кл., из крестьян, служащая, с января 46 г. работает инструктором Городокского РК ЛКСМБ.

За время работы показала себя способным комсомольским работником. Дисциплинированная, скромная, политически грамотная.

Пользуется деловым авторитетом среди комсомольцев и молодежи района.

Делу партии Ленина-Сталина предана.

Секретарь Городокского РК ЛКСМБ (Смирнов).

14.05.46.

**65. Характарыстыка**
**Кандрацьвай (Анціпінай) Вольгі Антонаўны**

Жыццёвы лёс Вольгі Антонаўны і Мікалая Іванавіча Анціпіных, якія вярнуліся на радзіму Вольгі Антоўны, склаўся шчасліва. Яны вырасцілі двух сыноў і двух дачок, вырастаюць 5 унукаў і 3 праўнукі…

Андрэй Геннадзевіч Кульбей, старшы выкладчык кафедры трубаправоднага транспарта і гідраўлікі, не згадзіўся з тым, што ў кнізе Уладзіміра Лабанка “Партызаны прымаюць бой”, прозвішча яго дзеда Андрэя Іванавіча Ерашэнка, як і шматлікіх іншых, сустракаецца толькі ў радзеле прыведзеных спісаў каманднага составу брыгады “За Савецкую Беларусь”. “Але хіба можна адным радком адзначыць увесь шлях, пройдзены чалавекам у цяжкія гады вайны?” – пытаецца ён.

У зборнік уключаны аповяд А. Г. Кульбея “Памяти моего дедушки”…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**66. Андрэй Кульбей.**
**“Памяці майго дзядулі”.**
Калаж

Лузгін Іван Іванавіч і Пётр Міронавіч Машэраў былі звязаны даваенным сяброўствам.



**67. Сустрэча сяброў-настаўнікаў.**
**Заольша. 1940 г.**
**Пётр Міронавіч Машэраў** *(крайні злева)* **і Лузгін Іван Іванавіч** *(крайні справа)*

Стаў партызанам П. М. Машэраў. Ваенным разведчыкам стаў І. І. Лузгін. Падчас Вялікай Айчыннай вайны сумесна з іншымі падрыхтаванымі асобамі ён быў пакінуты на часова акупаванай тэрыторыі БССР для арганізацыі і непасрэднага ажыццяўлення аператыўнай і рэгіянальнай стратэгічнай выведвальнай дзейнасці ў інтарэсах узброеных сіл СССР. Пасля вайны – настаўнічаў і стаў заслужаным настаўнікам БССР.

Аб гэтым распавёў старшы выкладчык кафедры крымінальнага права і крыміналістыкі Лузгін Іван Іванавіч.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Вольга Лісенкова, студэнтка групы 09 – Геа – 2 распавяла аб выпрабаваннях, якія выпалі работнікам спецыяльных фарміраваній Народнага камісарыята шляхоў зносін, сваіх прадзядуле Іване Кірылавічу Варапаеву і прабабуле Марыі Іваноўне Варапаевай, якія служылі на адным цягніку: Марыя была качагарам, а Іван – машыністам. Аб іх удзеле ў Вялікай Айчыннай вайне распавядаецца ў экспазіцыі Музея чыгуначнага транспарту г. Віцебска, супрацоўніцай якога з'яўляецца бабуля Вольгі Лісенковай – Людміла Іванаўна.




**68. Макет цягніка часоў Вялікай Айчыннай вайны ў Музеі чыгуначнага транспарту г. Віцебска**



**69. Чыгуначнікі Марыя Іванаўна і Іван Кірылавіч Варапаевы, якія прайшлі вайну на адным цягніку. 1940-я гг.**

Таццяна Дар'янава, рэдактар кніжнай рэдакцыі ПДУ распавяла аб выпрабаваннях сваіх бабулі і дзядулі – Зінаіды Іванаўны Лазаравай і Васілія Яфімавіча Засовіна. У Сталінград іх сям'я ў пачатку лета 1941 года прыехала да сваякоў з Камчаткі. Бацькі дзядулі, сем'і яго братоў, якія жылі ў Завадскім раёне Сталінграда, – усе загінулі ў 1942 годзе…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**70. Зінаіда Іванаўна Лазарава**

З асобым гонарам за сваіх продкаў, сям'ю Зямчонкаў і іх дзяцей Фларыяна і Вераніку распавяла Алеся Іосіфаўна Корсак, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі аб выратаванні яўрэйскай сям'і Горданаў у нарысе "Хто выратуе адно жыццё – выратуе цэлы свет". У 2000 годзе сваякі Фларыяна і Веранікі Зямчонкаў (па стану здароўя самі яны не змаглі прыехаць) атрымалі дыпломы Праведнікаў Свету ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі з рук консула Ізраіля Марціна Пеледа.



**71. Сем'я Земчонкаў.**
*Даваенны здымак*

У аповядзе "…Бярозка, уставай, ідзі!.." Алеся Іосіфаўна Корсак, піша: "Пад націскам болі страты і горычы Фэлікса Пятроўна Красоўская, не маючы нават пачатковай адукацыі, склала некалькі вершаваных радкоў, уклаўшы ў іх усё сваё жыццё…

Спалілі каты хату,
забілі маці радную, забілі тату,
двух братоў, як дубоў звалілі…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Яны іх білі, пыталі, нагамі таптаЛі,
Ну і відаць, яны ім нічога не сказалі.
А я бярозкай маленькай была,
Побач стаяла, ад бяды ўцякла,
Штосьці мяне да зямлі прыхінула
І сказала: “Бярозка, ты толькі маўчы, жыць табе трэба.”
Прытулілася я да зямлі –
Чула я стогн бацькоў і братоў з-пад зямлі.
Ну штосьці мне казала: “Бярозка, ты толькі маўчы...”
Прахадзілі побач мяне каты,
Яны не ведалі, што я з гэтай хаты.
Не білі, не пыталі і нагамі не стапталі.
Праляталі нада мной жураўлі ў цёплыя краі,
Адклікнуліся яны да мяне:
“Бярозка, уставай, ідзі! Наступаюць халады, загінеш ты.”
“Жураўлі мае мілыя, жураўлі мае сізакрылыя, няма ж куды ісці?
Няма ў мяне хаты, ні мамы, ні таты, ні братоў як дубоў.
Крылляў не маю з вамі ляцець”.
Адклікнуліся зноў да мяне жураўлі:
“Бярозка, стая твая людская,
К людзям ідзі, цяпла прасі, а то загінеш ты…”
“Доля мая, чым я цябе агарчыла?
Ні хлеба, ні солі ты мне не дала,
Бязмерна цяжкай боллю ты мяне нcorrespondingрадзіла
Чым жа я цебе ўгнявіла?
Доля мая, ня ўспела я падрасці –
Мне ж трэба боль такую цяжкую нясці.
Скажы, за што?
Доля мая, падкажы, як мне быць?
Як далей мне жыць?
Куды ж мне боль сваю цяжкую палажыць?”
Зноў адклікнулася доля:
“Бярозка, расхіні сваё маленькае сэрца,
І ў сэрца боль сваю палажы.
Ты падрасцеш, ты падужэеш –
Боль анямее, боль пацішэе.
Але будзеш ты датуль яе нясці, пакуль будзеш па зямлі ісці ”
“Доля мая, саглашуся я з табой тады,
Каб ніколі-ніколі, яшчэ раз, ніколі
Не прынасіла такой цяжкай болі,
Таму, хто ня ўспеў падрасці.
Вельмі ж цяжка яе нясці.
Буду я адна за ўсіх цяжкую боль нясці,
Хто не ўспеў падрасці…”
Наступіла зіма, боль мая астыла,
Я занемагла.
Пайду ў людскую стаю цяпла прасіць –
Трэба ж пачынаць як жыць.
Прыйшла я ў першую хату, адчыніла дзверы,
Нізка пакланілася я: “Стая людская, не адна я прыйшла,
Я вельмі боль сваю цяжкую прынесла.
І наступіла зіма. Дайце нам хоць сотую долю цяпла пакуль

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

я падрасту.
А як падрасту, за ўсё я вам заплачу.”
Знелюбіла нас стая людская, адчыніла дзверы сама:
“Вунь хата другая, ідзі туды цяпла папрасі,
Мне самой цяпла не хапае.”
Выйшла я на двор, а боль мая яшчэ цяжэй стала як прыйшла.
Ледзь я прыйшла да той хаты і боль да дзвярэй данясла.
Заўважыла там стая людская, што вельмі боль мая цяжкая.
Адчыніла дзверы сама і ў хату нас упусціла,
І не пыталася яна, чаго я прыйшла.
Яна ведала, што наступіла зіма,
І трэба нам даць хоць сотую долю цяпла, пакуль я падрасту.
Накарміла, абагрэла, ліповым чаем напаіла.
І не заўважыла я, як прыйшла вясна – засвяціла сонейка
ў ваконца.
Я вырасла!
І боль мая анямела, і боль мая палягчэла.
Выйшла я на двор. Гонкай, стройнай бярозкай я стала
З серабрыстай касой.
Стала вадзіць карагоды (у карагодзе я першай была!).
Прыгожая мая серабрыстая каса.
Сталі мною любавацца зялёныя дубочкі:
“Бярозка, у якіх краях ты расла? З якіх ты краёў да нас прыйшла?
Вельмі ж прыгожая твая серабрыстая каса!”
“Мае ж вы, дубочкі, мае ж вы галубочкі,
У гэтых краях я расла, з гэтых краёў да вас я прыйшла…”

Уладзімір Фёдаравіч Голубеў, дзед Аксаны Валер’еўны Голубевай, кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта кафедры тэхналогіі праграміравання, быў радавым байцом атрада імя Молатава партызанскай брыгады імя Сталіна (Ахоціна), якія дзейнічалі на Расоншчыне.

Адной са слаўных аперацый Расонскай партызанскай брыгады імя Сталіна, у тым ліку і атрада пад камандаваннем Дубняка (П. М. Машэрава), стаў разгром нямецкага гарнізона, змешчанага ў Россонах, і вызваленне Россон ад фашыстаў у верасні 1942 года. Аперацыя гэтая доўжылася каля месяца (у гэты час майму дзеду давялося жыць у адной зямлянцы з Пятром Міронавічам). Галоўны вынік Расонскага бою – ў Расонах і суседніх з ім раёнах была адноўлена Савецкая ўлада. З сямейнага архіва А. В. Голубева змясціла шматлікія фотаздымкі, якія красамоўна сведчаць аб гэтым.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**72. Уладзімір Фёдаравіч Голубеў у партызанскім дазоры.**
**1942 г.**



**73. Партызанская канцэртная брыгада.**
**Уладзімір Фёдаравіч Голубеў стаіць другі справа.**
**1942 – 1943 гг.**



**74. Баявое сяброўства незабыўнае…**
**Пётр Міронавіч Машэраў** (у цэнтры),
**Уладзімір Фёдаравіч Голубеў** (крайні зправа).
**Расоны.**
**1970-я гг.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

У Расонскай партызанскай брыгадзе імя Сталіна радавым быў і Пётр Еўдакамівіч Голубеў, бацька Аляксандра Пятровіча Голубева, намесніка дэкана радыётэхнічнага факультэта. 16-гадовым юнаком Пётр Голубеў стаў партызанам, у 1944 годзе быў прызваны на ваенную службу.

У 1960 – 1970-я гады Пётр Еўдакамівіч Голубеў ў Наваполацку вёў гуртkі радыётэлеграфістаў, радыстаў, калектыўнай радыёстанцыі і тым самым прадвызначыў лёс і свайго сына і іншых сваіх выхаванцаў, звязаўшы іх з радыётэхнікай.



**75. Пётр Еўдакамівіч Голубеў** (сядзіць), **Аляксандр Голубеў** (стаіць попабач)
**і ўдзельнікі гуртка радыстаў станцыі юных тэхнікаў у СШ № 4 г. Наваполацка.**
**1970 г.**

Дзяніс Уладзіміравіч Дук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі змясціў у зборніку “Успаміны ветэрана”. Успаміны напісаны яго бацькам, Дукам Уладзімірам Дзянісавічам.

Калі пачалась вайна, Уладзіміру Дуку было ўсяго 14 год і, безумоўна, ён і ўявіць сабе не мог, якія выпрабыванні прыгатаваў яму лёс… Падрыўнік у партызанскім атрадзе. Нямецкі палон. Канцлагер. За скібку хлеба і міску супа – прымусовая праца на ферме. Уцёк з палону. Служба ў савецкім войску ў Аўстрыі, Венгрыі…

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**76. Дук Уладзімір Дзянісавіч.**
**Венгрыя.**
**1949 г.**

Студэнт групы 09-ТЭА В. Э. Стацэвіч распавёў аб цяжкіх выпрабаваннях, якія зведала яго бабуля Соф'я Ігнацьеўна Мышко. Яна была вязніцай дорфлагера Блехамер (Польшча). "Што прыйшлося зазнаць у няволі, – гаворыць бабуля, – можа прадставіць толькі той, хто пабываў там: гэта вечны голад, сорам і зневажанне…"



**77. Помнік ахвярам фашызма ў Бляхоўні (Блехамер).**
**Польшча**

Людміла Канстанцінаўна Фёдарава (Мяхедка), выкладчыца рускай мовы для замежных студэнтаў ПДУ змясціла вялікі матэрыял пад назвай "Адмеціны на сэрцах". У ім раскрываецца лёс яе маці Алены Цімафееўны Мяхедка, якая памечана навечна нічым не змываемым нумарам 65.948 у адным з самых жудасных канцлагераў – Асвенцыме.

А. Ц. Мяхедка пражыла складанае, але шчаслівае жыццё. Яе шчасце – яе дзеці, унукі і праўнукі. "Адмеціны на сэрцах" – гэта шчырае прызнанне ў каханні і павазе да Маці.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**78. Алена Цімафееўна Мяхедка**
**ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры**
**2007 г.**

Марына Віктараўна Куксёнак-Сімановіч, захавальнік фондаў Музея навукі і асветы Полаччыны лічыць, што духоўна звязана са сваім дзядуляй Дзмітрыем Фёдаравічам Куксёнкам, ганарыцца ім. Таму свой аповяд яна так і назвала “Мой дзядуля”. Выпрабаванні вайны выпалі на дзіцячыя гады Дзмітрыя Фёдаравіча. Аб перажытым ім і яго роднымі ў палоне М. В. Куксёнак-Сімановіч падрыхтавала матэрыял “Ахвяры аперацыі “Генрых”. У ім дэталёва распавядаецца аб мытырствах у Прыбалтыцы, куды іх закінула вайна…



**79. Дзмітрый Фёдаравіч Куксёнак з унучкай Марынай.**
**1986 г.**

Ірына Мікалаеўна Андрэева кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры тэхналогіі і методыкі выкладання запісала успаміны сваёй маці Ніны Міхайлаўны Андрэевай (Карэнеўскай) былой настаўніцы рускай мовы і літаратуры СШ № 8 г. Полацка “Такое на забываецца”.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**80. Ніна Міхайлаўна і Ірына Мікалаеўна Андрэевы**

Тут змешчаны ўспаміны аб вайне і яе светаадчуванні маленькай дзяўчынкай Нінай, і аповяд аб родных і блізкіх, якія прайшлі праз вайну, сярод якіх ёсць Герой Савецкага Саюза…



**81. На дарогах вайны…**
**Мікалай Мітрапольскі** (крайні злева) **– будучы Герой Савецкага Саюза;**
**Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў** (крайні справа) **– будучы**
**відны палітычны і дзяржаўны дзеяч Савецкага Саюза.**
**Пачатак 1943 г.**

Анастасія Эдуардаўна Цыбульская, рэдактар кніжнай рэдакцыі рэдакцыйна-выдавецкага аддзела аповяд “Пра маму і тату” – Яцына Надзею Вячаславаўну і Эдуарда Антонавіча пачала пранікнёнымі словамі: “Дзякуй вам, тата і мама, мае родныя, любыя, мае адзіныя. Дзякуй вам за тое, што я нарадзілася і жыву ў цудоўнай краіне, імя якой – Беларусь. Дзякуй за тое, што вы – сціплыя, працавітыя, з вялікім пачуццём гумару – былі заўсёды прыкладам для мяне і маіх сыноў – вашых унукаў. Вам выпала нялёгкая доля, але вы ўжо даўно даравалі свету за тое, што былі пазбаўлены дзяцінства і юнацтва на доўгія ваенныя гады.

Гэтыя радкі – пра вас…”

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com



**82. Надзея Вячаславаўна і Эдуард Антонавіч Яцына.**
**1952 г.**

Пятнаццацігадовым хлопцам у верасні 1943 года быў насільна вывезены Эдуард Яцына ў Аўстрыю, дзе вымушаны быў цяжка працаваць на рамонце чыгуначных пуцей.

Надзея Танюкевіч (Яцына), яе маці, яе браты і ўсе людзі, што жылі ў вёсцы Паддубы, што на Полаччыне, пазналі жах вайны

"Дзве гісторыі самых блізкіх мне людзей, вось такі лёс выпаў на долю маіх таты і мамы. Звычайны лёс звычайных беларусаў. Яны не ўчынілі нічога гераічнага, проста змаглі выжыць у той страшны час ваеннага ліхалецця і падаравалі жыццё мне. Нізкі ім паклон." – заканчвае А. Э. Цыбульская.

Аляксандру Аляксандравічу Нікіфараву, старшыму выкладчыку кафедры замежных моваў, было 6 гадоў, калі не стала яго дзеда – удзельніка вайны, танкіста Пятра Іванавіча Нікіфарава…



**83. Аўстрыя. Канец вайны…**
**Пётр Нікіфараў** *(крайні справа)* **– адзіны з усмешкай на твары.**
**Май 1945 г.**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

"Тым не менш, мне быў вядомы той факт, што мой дзед ваяваў.

Само слова "ваяваў" мела для мяне, як і для любога хлапчука, выключна гераічнае напаўненне, пазбаўленае трагізму і гора, якое разумее вайна. Маючы багаты арсенал ваенных цацак з перавагай танкаў і БМП, шмат аб іх устройстве і камплектацыі я пазнаваў ад дзеда-танкіста і ад бацькі, які скончыў танкавае вучылішча. У такім рамантычным ключы мне ўяўлялася служэнне Радзіме, і сябе ў будучыні я бачыў камандзірам танка або хоць бы механікам.

Мае бабуля і дзядуля жылі ў Батумі, куды я дзіцем чатырох-пяці гадоў прыязджаў на лета. Апроч бясконцых купанняў у Чорным моры мне запомніліся вячэрнія прагулкі з дзедам уздоўж берага. У адну з такіх прагулак паблізу берагавых умацаванняў, пабудаваных для адбіцця атак з мора, я захацеў паесці суніц, якія раслі каля бетонавых дотаў. І вось я памятаю, як дзед спыніў мяне, ужо потянуўшыгася сарваць пару ягад. Я нават і не здагадваўся, чаму вакол столькі ягад, а іх ніхто не зрывае. Тады дзед растлумачыў мне, што гэтыя ягады ніхто не чапае, таму што яны ёсць кроў загінулых тут салдат, што сарваць іх – блюзнерства. З тых часоў для мяне маленькія сунічныя кроплі – кроплі крыві аддаўшых жыццё за Радзіму…"

Далей А. А. Нікіфараў узрушана гаворыць пра пачуцці маладога чалавека, які не ведаў вайны: "Той факт, што салдаты былі нечымі дзецьмі, бацькамі, братамі, сёстрамі і што іх смерці прынеслі столькі гора іх сем'ям, вельмі ўразіў мяне. Я з жахам уявіў, што давялося б мне адчуць, калі б я страціў блізкага чалавека…"

Развагі і думкі Аляксандра Нікіфарава – галоўны лейтматыў зборніка "Вялікая Айчынная вайна ў нашых лёсах". Наша памяць, нашы пачуцці – гарантыя таго, што выпрабаванні 1941 – 1945 гг. не паўторацца.

За працу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню загадчыца музея Грудніцкая Тамара Аляксандраўна была ўзнагароджана юбілейным медалём "60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.", а ў 2010 годзе ўзнагароджана нагрудным памятным знакам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта "За ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі".

З лістапада 2003 г. па ініцыятыве Т. А. Грудніцкай штогод выдаецца бюлетэнь "Памяць", які ўдзячна ацэнены грамадскасцю ва ўніверсітэце. Сумесна з бібліятэкай, у сакавіку 2004 г. быў падрыхтаваны электронны варыянт выдання па гісторыі асветы і адукацыі на Полацкай зямлі. Структура створанай тэкставай базы дадзеных адлюстроўвае этапы развіцця асветы і адукацыі ў сістэме прынятай гісторыка-педагагічнай

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com